# Насустрач чытачу

**У Нацыянальнай бібліятэцы ў межах цыкла «20 пытанняў пісьменніку»прайшла сустрэча з Віктарам Праўдзіным.**

Імпрэза сабрала аматараў беларускага мастацкага слова. Пісьменнік расказаў пра свой шлях у літаратуру, раскрыў сакрэты напісання твораў (дарэчы, многія з якіх заснаваны на выпадках з рэальнага жыцця), падзяліўся цікавымі гісторыямі. Пытанні, якія задавалі Віктару Аляксандравічу, тычыліся не толькі яго творчасці, але і асабістага жыцця.

Віктар Праўдзін з задавальненнем адказваў на пытанні слухачоў, уступаў у дыскусіі і разам з аўдыторыяй разважаў на вечныя тэмы дабра і зла, кахання і нянавісці.

Сюрпрызам для аматараў творчасці пісьменніка стаў нечаканы і шчодры падарунак — некалькі экзэмпляраў рамана «Іду насустрач». Падчас сустрэчы ўдзельнікі мерапрыемства змаглі атрымаць аўтограф і зрабіць фотаздымак з пісьменнікам.

Наступная сустрэча ў межах цыкла «20 пытанняў пісьменніку» адбудзецца 30 студзеня.

**Лізавета КРУПЯНЬКОВА**